...Звініць апошні званок, гасне святло, і мы аказваемся ў перакуленым свеце беларускага сцэнічнага мастацтва. На авансцэне — труна; гэта развітаўся з жыццём яшчэ адзін народны небарака-купалавец. На пярэднім плане — з паўдзесятка рэжысёраў. Як калоду картаў, дзе ўсе — тузы, іх ужо добрых дваццаць год тасуе Міністэрства культуры. Далей ідзе масоўка — артысты:бяспраўныя, часта незадаволеныя, а то і душэўна хворыя людзі, якім воплескі залы неабходны, як валяр'янка нанач.



Не верце вачам сваім: калі на афішы пазначана «Магілёўскі абласны», то гэта калектыў горада Бабруйска, калі «Мінскі абласны» — то гэта маладзечанскі. У гэтым падманным свеце ніхто не кажа праўды публічна, усе прыметнікі толькі з часціцай «най», а адзнакі прадыктаваны інтарэсамі групы альбо ўласнай выгадай. Да зацяжнога крызісу прывыклі, як да чаднага гарадскога паветра, і ўсе робяць выгляд, што нічога асаблівага не адбываецца. Ну, яшчэ адна заўчасная смерць, яшчэ адна драма незапатрабаванага творцы, яшчэ адна «купленая» пастаноўка...

«Любите ли вы театр?» Я асабіста яго шкадую. І радуюся тым нячастым творчым удачам, якія насуперак усяму маюць месца. Вось і маладзечанскі (ён жа Мінскі абласны) прыехаў на гастролі ў сталіцу і паказаў на пляцоўцы Маладзёжнага некалькі неблагіх спектакляў. З шасці прывезеных — цэлых тры, дзе аўтары мясцовыя: малады пісьменнік Леанід Вашко («Секс па перапісцы»), знакаміты драматург Аляксей Дудараў («Вавілон», перапрацаваная інсцэніроўка па аповесці Уладзіміра Някляева «Вежа») і паэтка Галіна Булыка (інсцэніраваная казка «Чарадзейства ў краіне Оз»). Лепшым з гастрольных спектакляў прызнаны «Караль» па п'есе польскага драматурга Славаміра Мрожака (рэжысёр-пастаноўшчык — В. Растрыжэнкаў, мастак — В. Цімафееў, музычнае афармленне — А. Залётнеў).

Жанр спектакля пазначаны як «драматычная клаўнада». Спачатку і сапраўды здаецца, што памыліўся і трапіў у цырк: клоўны галёкаючы выскокваюць на сцэну з цёмнай залы, чым добра-такі псуюць першапачатковае ўражанне. Бо на сцэне — загадкавая прасвечаная шырма, за якой грае на раялі нехта інтэлігентны. Цыбаты інтэлігент аказваецца акулістам (Я. Іўковіч). Наведвальнікаў двое: сухенькі Дзядуля (В. Багушэвіч) і каржакаваты Унук (А. Чэчанеў), які дзедам маніпулюе.

Не адразу можна зразумець, што адбываецца на сцэне. Адно ясна: ад гэтых «хворых» дабра не чакай, бо дзед не выпускае з рук дубальтоўку і збіраецца кокнуць некага Караля. Той Караль, як і славуты Гадо, мог бы і не з'явіцца, але к фіналу ўсё ж прадстае перад намі ў выглядзе прастрэленай, з ануч зробленай лялькі.

Парачка перш іграе «пад дурняў»: старому трэба праверыць зрок. Складзеных з вялікіх літар слоў «СВАБОДА» і «МІР» ён не бачыць ва ўпор. Методыка не тая — дзед проста непісьменны. Падбухтораны ўнукам, ён раз за разам настаўляе стрэльбу на беднага доктара. Справа ў тым, што якраз у ім западозрылі міфічнага Караля. У працэсе гаворкі высвятляецца, што гэтых Караляў можа быць некалькі. «Вы ўсе — Каралі», — кідае адзін з персанажаў у залу.

Перад намі, несумненна, разгортваецца драма бесхрыбетнага інтэлігента, які ўпэўнены, што страляць лепш у неба, а не ў людзей, і сур'ёзна ставіцца да такіх паняццяў, як дэмакратыя і гуманізм. Вось толькі адстойваць гэтыя паняцці на практыцы не хапае ні сілы, ні мужнасці.

Госці (а яны сімвалізуюць, верагодна, агрэсіўны плебс) тым часам становяцца ўсё больш самаўпэўненымі і нахабнымі: адбіраюць у доктара акуляры, прымушаюць хавацца, а потым выпорваюць са сховішча, застрашваюць. І ўрэшце пакідаюць разам з трупам — канчаткова дэмаралізаванага і разгубленага. Яшчэ адзін Клім Самгін, *толькі не вядома*, якога народа. Мабыць, гэта тып інтэрнацыянальны.

У спектаклі ўражваюць пластыка і дружны акторскі ансамбль, вынаходлівая сцэнаграфія і цікавыя мізансцэны, дынамізм дзеяння. Венядзікт Растрыжэнкаў за два гады існавання спектакля, кажуць, значна скараціў яго і памяняў нюансы. Хаця даводзілася чуць думку, што абсурдысцкія п'есы ў выкананні славян выглядаюць, як пінжакі з чужога пляча. Тым не менш, яны ўзбагачаюць акторскую тэхніку і ўжо таму маюць права на існаванне. ■

ВЫСТАВА

ЗАПАТРАБАВАНЫЯ ЧАСАМ

Ганна Трусава

Палітычная вясна працягваецца ў халаднаватых залах Палаца мастацтваў, дзе *пад спевы і танцы* адбылося адкрыццё выставы «Адраджэнне—2000».



З зімовых майстэрняў мастакі прынеслі творы апошніх гадоў. Дзе сакура квітнее, дзе міндаль. А ў беларускай прыродзе прарасла бульба. Гэтую з'яву і назірае большасць беларусаў у хатніх кошыках, мяшках і падвалах. Таму твор мастака Віктара Мікіты «Бацькаў кошык» прыцягнуў увагу большасці наведвальнікаў. Карціна, на першы погляд дэкаратыўная не толькі па кампазіцыйных прыёмах, але і па арыгінальнай тэхніцы выканання, адыграла ролю своеасаблівага сімвала выставы.

І побач — прыемныя рытмы лесу і мора таго ж аўтара, якія дораць нам цудоўныя ўспаміны, вабяць вытанчанай каляровай гамай. Шчаслівы ўладальнік такіх твораў мае магчымасць выкарыстоўваць іх у самых розных прызначэннях, бо яны здольныя зрабіць непаўторным кожны інтэр'ер.

А вакол — глабальны позірк мастакоў на сёняшні дзень краіны. Адзначым, што неўвядальны ў беларускім мастацтве жанр пейзажу не распаўсюдзіўся па выставе. Мастакам не да краявідаў. Успамінае наваколле ў сваіх сціплых акварэлях Мікола Купава, а Віктар Маркавец сумуе па ўжо не існуючай старажытнай Замкавай вуліцы. Яшчэ не так даўно фарбы старога Мінска магчыма было назіраць літаральна , а зараз яны — толькі ва ўспамінах і на звонкім палатне мастака.

У большасці твораў — надзея. Яна ў «Малітве аб незалежнасці Беларусі» Генадзя Драздова, ў «Еднасці» Пятра Русака.

А аб тым, што зараз — у творах Алеся Марачкіна «Русская частушка» і «Татка! Уставай,ужо ідуць». Мастацтва прапаганды, у якім пераплялiся матывы лубка з някрасаўскім настроем. Надзея на тое , што такі моцны арсенал сродкаў зробіць мастацтва зразумелым. Але ж пакуль , як і на самой справе, толькі канстатацыя. Напамін аб Міроне — як міф. Калі ён ажыццявіцца — убачым і твар героя. А цяпер — толькі сілуэт на фоне неба.

Творы Алега Карповіча вяртаюць нас да рэчаіснасці. Простым алоўкам намаляваны яго рэпартаж аб жыцці краіны за мінулы год. Гэта своеасаблівая мазаіка, складзеная прэзідэнтам. Перад намі праходзяць твары Тамары Віннікавай, Генадзя Карпенкі, Віктара Ганчара, Юрыя Захаранкі, трагедыя на Нямізе. Востры аловак мастака быццам гатовы працягваць галерэю сумных партрэтаў.

Выстава прапануе шэраг жывапісных работ, выкананых у абстрактным стылі. Назвы прыцягнуты да рэчаіснасці.

Палотны Сяргея Крыштаповіча я заўважыла, амаль скончыўшы прагляд выставы: яны прытуліліся ў кутку. На самой справе, у мастацтве — як у жыцці. Пацвярджэнне таму — назва адной з кампазіцыяў: «Птушкі ў акварыўме». ■

СПАКАЗ

ФОТА EX MACHINA


Троян Спаткі

Галярэя візуальных мастацтваў «NOVA», што месьціцца ў Цэнтральнае бібліятэцы імя Янкі Купалы, працягвае сваю надзвычай плённую працу. Да 24-га красавіка тут працавала выстава «Фатаграфія «вырашальнага моманту». Беларускі варыянт». А ўжо 28-га красавіка пад куратарствам Аляксандра Давыдчыка распачынаецца наступны праэкт: «Фатаграфія з машыны».

Калі ў папярэдняе выстаўцы брали ўдзел 11 мастакоў, дык у прэзэнтуемым спаказе спадарству прапануюцца творы ўсяго толькі двух фатографаў: Уладзімера Казлова ды Валерыя Савульчыка. Гэта маладыя меньскія кудзебнікі, якія мінімальным чынам удзельнічаюць у хімічнае апрацоўцы сваіх здымкаў. Ракурс і сьвятло ў творах гэтых маладзёнаў адлюстроўваюць дыназміку рэальнага жыцьця зроку якой-небудзь істоты ў сусьвеце ўсякдзённага сьвятла. Разам з тым, гэта ж дазваляе нам паназіраць за вонкавымі перамяшчэньнямі нашага з вамі зроку ў звычайнае штодзёншчыне. Такія працы падкрэсьлена фізічны, бо пры іх дапамозе не малююць, а ўспрымаюць навакольную рэчаіснасьць. Выстава будзе працаваўшы да канца траўня, і ўсе будуць меўшы магчымасьць *зазірнуць на* Веры Харужай, 16, з 12-ці да 18-ці гадзінаў штодзень, акрамя аўторкаў, суботаў і нядзеляў.

Дарэчы, ужо вядомы топікі будучых, летніх выставаў. 26-га траўня адчыняецца «Прыватная гісторыя калектыву» — спроба асэнсаваньня па матар'ялах фатаграфіяў дрэйфу ўяўленьняў пра калектыўнае й індывідуальнае ў беларускае мэнтальнасьці. А 23-га чэрвеня плянуецца адчыніць спаказ «Homo Novus». Гэта будзе супольная выстаўка маладых беларускіх фатографаў-дэбютантаў. Куратар гэнае сэрыі выставачных праэктаў пад агульным назовам «Аспэкты сучаснае беларускае фатаграфіі» — Уладзімер Парфянок. Таксама, калі ў вас зьявілася жаданьне паўдзельнічаць у гэтых і іншых спаказах, са сваімі фотапрацамі й пытаньнямі можна зьвяртацца ў галярэю «NOVA», пакой 11, з 17-ці да 19-ці гадзінаў кожны панядзелак, сераду й чацьвер, ці па тэлефоне: 234-46-21.

ВОЛЬНЫЯ ТАНЦЫ-2



НОВАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА

Яўген Усошын

19 красавіка ў канцэртнай залі «Мінск» адбылася прэзентацыя другога альбому «Вольныя танцы» выдаванай БМАgroup «правільнай музыкі». Гэты альбом аформлены дадатковай назвай «новая альтэрнатыва», што мусіць падкрэсліць яго альтэрнатыўнасць мэйн стрыму сучасных маладзёвых густаў, арыентаваных на спажыванне небеларускай музыкі, да таго ж перадусім папсы.

Але *кампілятары* з БМАgroup не ставяцца варожа да жанру папулярнай музыкі як бальшавікі ставіліся да буржуазіі. На прэсавай канферэнцыі, якая папярэднічала фэсту, прадстаўнікі БМАgroup заявілі, што згодныя і зацікаўленыя ў выпуску *падобнага кшталту альбома з беларускімі* папсавікамі. Беларускія шоў-дзялкі ўжо рыхтуюцца выдаць спевы беларускай эмігранткі Вольгі Казак, якая, паводле іх словаў, спявае на сусветным узроўні менавіта папулярную музыку.

Сам дыск уключае ў сябе колькі кампазіцый мастадонтаў беларускага року, такіх як Новае Неба, NRM, Нейро Дюбель, Палац, Уліс. Сярод якіх праглянуліся і кампазіцыі маладняка Long Play, Happy Face, Exist і іншых. Маладыя выканаўцы патрапілі ў гэтую кампілятыўную зборку, дзякуючы сваёй дастатковай альтэрнатыўнасці і якасці запісу. Якасць ацэньвалася як з тэхнічнага пункту гледжання, такі і музычнага. У ролі мастацкай камісіі выступалі спадары Супрановіч і Бялевіч — галоўныя завадатары БМАgroup.

Усе *кампазіцыі*, акрамя нейрадзюбелеўскіх «Звёздочек», гучаць па-беларуску. Дюбеля па нейкіх прычынах не здолелі выканаць сваю папярэднюю дамоўленасць з БМАgroup *і не прадставілі* свайго беларускамоўнага запісу, таму ў альбом увайшоў рэмікс іх старэнькай песні. Але гэтую кампазіцыю арганізатары прэс-канферэнцыі ўсё адно ацанілі як сенсацыйную.

Апроч новых кампазіцыяў на CD знайшлося месца і старой улісаўскай «Радыё Свабода», яшчэ ў выкананні Андрэя Патрэя. Сярод новых кампазіцыяў можна вылучыць завадную «Wild Girl», ды кампазыцыю «Я» ў выкананні беластоцка-мінскага гурту R.F.Braha. Мелодыка гэтай кампазіцыі падобная на нешта французскае і выпукла маскуліністычнае. Цікава гучаць таксама гурты *Безь Білета і Happy Face.*

Кампілятары мяркуюць удала скончыць сваю другую спробу па камерцыйнаму распаўсюджанню дыска. Мінулы дыск не атрымаў камерцыйнага поспеху, і яго выдаўцы вымушаны былі распаўсюджваць бясплатна. Праўда, распаўсюджаны такім чынам, ён усё адно служыць абвешчанай мэце БМАgroup. ■

PLEIN AIR

ВОЛЬНАЕ ПАВЕТРА

Троян Спаткі

Ведай, брат малады, што ў грудзёх у людзей
Сэрцы цьвёрдыя, быццам з каменьня.
(Максім Багдановіч)

Міжнародны плянэр скульптуры ў граніце Integrart прайшоў у Палацы мастацтваў пад фундатарствам Польскага інстытуту ў Меньску, Рэгіянальнага цэнтру культуры й мастацтва з Сувалак (Польшча) ды Міністэрства культуры РБ.

У ніводнага славянскага народу не захавалася столькі лягэндаў і паданьняў пра валуны, як у беларусаў. На Беларусі любяць параўнаньне: шмат, як камянёў. Сапраўды, тут іх безьліч. Валуны — неад'емная частка нашага краявіду. На першы погляд здаецца, што камяні — зацятыя моўклі. Аднак калі разумееш іх мову, то камлыгі могуць паведаміць шмат цікавага пра сябе. Мову камянёў лепш за ўсіх ведаюць гэолягі, дэманстранты ды мастакі.

Адзінадцатая выстава гранітнае скульптуры *прэзэнтуе* выкшталцоныя працы 37-мі камянараў зь Летувы, Францыі, Польшчы, Нямеччыны, ЗША й Беларусі. Ад нашае краіны ў спаказе бяруць удзел Андрэй Вараб'ёў, Віктар Копач, Андрэй Асташоў. А твор Ігара Засімовіча «Выкраданьне Эўропы» падаўся нам адным з найбольш цікавых. Апасьля Меньску, у траўні плянэр адбудзецца ў Музэі Альфонса Карнага ў Беластоку (ех-Беларусь), а ў жніўні — у Любліне (Польшча).

Упершыню плянэры Integrart былі зарганізаваны ў 1990 годзе Варшаўскім зьвязам польскіх мастакоў. З самага пачатку мэтаю спаказаў камянаваных скульптураў *было знаёмства спаміж* сабою кудзебнікаў розных нацыянальнасьцей і культураў. Разам з палякамі ў вакцыях *на вольным паветры* ўдзельнічалі камянары з *Аўстрыі, Славакіі, Швэцыі,* Ангельшчыны, Летувы, Нямеччыны, ЗША. Цешыць, што й у нашае краіне ёсьціка скульптары, за якіх ня сорамна мець гонар.

Адкрыцьцё плянэру пачалося са спазьненьнем і прайшло амаль незаўважаным. Польскі бок, як звычайна, узгадваў залатое стагодзьдзе, калі Rzeczpospolita была *ad morza da morza*. Беларускі бок унісоніў словамі аб больш шчыльным супрацоўніцтве *Kresow Wschodnich* з Карунаю. Нешматлікая публіка цешылася клясычнаю музыкаю ў live-выкананьні. Таптала «прадбачліва» *раскіданыя па падлозе шыльдачкі* зь імёнамі камянараў і назовамі іх працаў. Млява разглядала прыгожа разпастаўленыя на падумэнтах бруднага белага колеру цудоўныя валізкі зь мініятурным гальчаком нямецкае скульптарцы Susanne Ruoff, твор «Скарбы». Вылічвала дні й тыдні ў своеасабліва вытанчаным «Каляндары» мастачцы Beata Wehr з ЗША. Гозкія камяні падаліся фіялетавымі толькі нейкаму пад шафэ інтэлегэнту, які з усіх сіламоц заляцаўся да дзьвюх дзяўчат. А ў гэты час *en plein air* выставачнае залі вымалёўвалася чаканьне фуршэту. ■

ВТОРНИК, 2 МАЯ

7.00, 9.00, 14.00 **Новости** 7.10 Армейский магазин **7.40** «Дисней-клуб». «Аладдин». **8.10** Утренняя звезда **9.10** Премьера. Веселые истории в журнале «Ералаш». **9.30** Здоровье **10.00** Ускоренная помощь **10.30** Семейная комедия «Альф». **11.00** «Пармская обитель». 2-я серия **12.35** С днем рождения, «Ералаш»! Праздничный концерт **14.10** «Дисней-клуб». «101 далматинец». **14.40** «Дисней-клуб». «Новые приключения Винни-Пуха». **15.05** Умницы и умники **15.30** «Эх. Семеновна!» **16.10** Хоккей. Чемпионат мира. Сборная Беларуси - Сборная Латвии. **18.10** Михаил Евдокимов и его друзья **20.00** Время **20.45** Суперкомедия «Один дома-II». **22.55** «Юрий Визбор. Разрешите вам напомнить о себе...» Концерт

7.00 Комедия «Пока безумствует мечта». **8.20** Первая церемония вручения национальной премии «Циркъ». **9.35** Доброе утро, страна. **10.15** «Золотой Остап». Фестиваль сатиры и юмора. **12.00, 19.00** Вести. **12.20** Мелодрама «Зита и гита». **15.10** «Устами младенца». Телеигра. **16.10** Комедийный боевик «Близнецы-драконы». **18.05** «Два рояля». **19.40** Комедия «Про бизнесмена Фому». **21.20** «Плесните колдовства». Творческий вечер Ларисы Рубальской. **23.05** Премьера фильма. «Сердце Клары».

9.05 «Аплодисменты... аплодисменты». Худ. фильм. **10.15** Песни Ф.Шуберта и И.Брамса исполняет М.Майский. **10.45** Фантазеры. **11.30, 13.30, 21.00** Новости культуры. **11.40** «Сыновья дровосека», «Разбойничья сказка». Мультипликационные фильмы. **12.15** «Вижу цель!» Тележурнал. **12.45** «П.И.Чайковский. Избранное». Первый концерт для фортепиано с оркестром. Дирижер А.Кац. Солист Д.Мацуев. **13.45** «Собака Баскервилей». Сериал. **14.40** «Новый русский пасьянс». Ефим Шифрин. **15.35** Мультфильм. **16.05** «Цитаты из жизни». Александр Городницкий. **16.45** «Три вечера в «Театре Луны». Передача 3-я. **17.30** Новости. **17.35** В Лондонском Гайд-парке. Г.Гендель. Сюиты. «Музыка на воде», «Музыкальный фейерверк». Исполняет Лондонский филармонический оркестр. Дирижер А.Превин. **18.30** «Ученик лекаря». Худ. фильм. **19.40** Вечерняя сказка. **19.50** «Болек и Лелек на каникулах». Мультсериал. **20.05** Конкурс актерской песни им. Андрея Миронова. **21.20** «Девичья весна». Худ. фильм. **22.55** «Московский ноктюрн». Док. фильм.. Режиссер Г.Городний.

6.55 Анонс дня. **7.00, 9.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00** Сегодня. **7.15** «Закон джунглей» (США). **7.40** Мультфильм. **7.55** Час сериала. «Бандитский Петербург». Фильм 1-й. «Барон». 1-я серия. **9.25** Наше кино. «Запасной игрок». **11.30** Криминал. «Чистосердечное признание». **12.00** «Итого» с Виктором Шендеровичем. **12.20** «В нашу гавань заходили корабли». Программа Э.Успенского. **13.10** Фильм-сказка «Приключения Пиноккио». **15.30** Сериал «Лоис и Кларк. Новые приключения супермена». **16.25** Худ. фильм. «Фронт без флангов». 2-я серия. **18.40** Премьера НТВ. «Бандитский Петербург». Фильм-1-й. «Барон». 2-я серия. **19.50** Премьера НТВ. Геннадий Хазанов. «Жил-был я...». **20.35** Профессия - репортер. Андрей Антонов. «Мы - кузнецы!». **21.35** Футбол. Лига чемпионов. 1/2 финала. «Валенсия» (Испания) - «Барселона» (Испания). **23.35** «Антропология».

СРЕДА, 3 МАЯ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.50 Новости **8.15** «Нежный яд». Сериал **9.15** Поле чудес **10.15** Сильнейшие люди континента на ОРТ. Итоги Чемпионата Европы по тяжелой атлетике **13.30** Программа «Вместе». **14.20** Мультсериал «Невероятные приключения Джонни Квеста». **14.40** Классная компания **15.00** Зов джунглей **15.25** ...До шестнадцати и старше **16.00** «Нежный яд». Сериал **17.30** Маски-шоу **18.00** Погода **18.05** Худ. фильм «Они сражались за Родину». Часть 1-я **19.45** Спокойной ночи, малыши! **20.00** Время **20.50** Хоккей. Чемпионат мира. Сборная Швейцарии - Сборная России. **23.05** Боевик «Изумрудный солдат»

7.00, 8.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. **7.20** Телеспецназ: «Дежурная часть». **8.40** «Арена - спорт». Тележурнал. **9.20** «Цыганка». Сериал. **10.05** «Санта-Барбара». Сериал. **15.40** Мультфильмы. **16.30** «Башня». **16.55** «Круглая дата». Наталья Бондарчук. **17.25** «Театр + ТВ: театральные романы». Часть 2-я. **18.25** Сам себе режиссер. **19.45** «Дикий ангел». Сериал. **20.45** Хоккей. Чемпионат мира. Сборная Чехии - сборная Канады. **23.35** «Футбол + ТВ» с Александром Вайнштейном. **0.30** Телеспецназ: «Дежурная часть».

9.05 «Обитель радости». Док. фильм. **9.35** Отечество и судьбы. «Бенуа». Часть 1-я. **10.00** Произведения Ф.Мендельсона. Исполняет камерный оркестр «Музика вива». **10.30** «Гулливер в Лилипутии». Телефильм **11.30, 13.30, 19.30, 23.00** Новости культуры. **11.40** «Кармен». Худ. фильм. **13.15** Живое дерево ремесел. **13.45** Мультфильм. **14.15** «Царская ложа». День танца. **15.00, 17.30** Новости. **15.10** «Чародей». Сериал. **15.35** Авторская программа Ю.Лотмана. Передача 10-я. **16.15** Ноу-хау. **16.30** «Гулливер в Лилипутии». Телефильм. **17.40** Архитектурная галерея. **17.55** «Дети евреев». Док. фильм. **18.45** «Времена не выбирают». Элем и Герман Климовы. **19.10** Вечерняя сказка. **19.20** «Болек и Лелек на каникулах». Мультсериал. **19.50** «Обитель радости». Док. фильм. **20.20** Мультфильм для взрослых. **20.35** После новостей... **20.55** К 100-летию Ф.Никитина. «И жизнь, и слезы, и любовь». Худ. фильм. **22.40** Играет оркестр «Филармония наций».

5.00 Сегодня утром. **5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30** «Сегодня утром». Информационная программа. **7.50** Час сериала. «Бандитский Петербург». Фильм-1-й. «Барон». 2-я серия. **9.00, 11.00, 13.00. 15.00, 18.00, 21.00** Сегодня. **9.25** «Свидетель века». Программа Владимира Кара-Мурзы. Лев Безыменский в фильме «31 января 1943 года». **9.40** Без рецепта. **10.10** Герой дня без галстука. **10.40** «Среда». **11.30** «Старый телевизор» вспоминает. Фильм Романа Кармена «Неизвестная война». Битва за Берлин». **13.25** Наше кино. «Жил-был доктор...». **15.30** Сериал «Лоис и Кларк. Новые приключения супермена» (США). **16.25** Худ. фильм. «Фронт за линией фронта». 1-я серия. **18.40** Премьера НТВ. «Бандитский Петербург». Фильм-1-й. «Барон». 3-я серия. **19.50** Премьера НТВ. Геннадий Хазанов «Жил-был я...». **20.35** Профессия - репортер. Александр Зиненко. «Последняя коммуна». **21.35** Футбол. Лига чемпионов. 1/2 финала. «Реал» (Испания) - «Бавария» (Германия). **23.35** «Антропология».

ЧЕТВЕРГ, 4 МАЯ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.20 Новости **8.15** «Нежный яд». Сериал **9.15** Маски-шоу **9.45** Ищу тебя **10.30** Сериал «Новые приключения Синдбада». **13.30** Программа «Вместе». **14.20** Мультсериал «Невероятные приключения Джонни Квеста». **14.40** Семь бед - один ответ **15.00** Программа «100%». **15.25** ...До шестнадцати и старше **16.00** «Нежный яд». Сериал **17.30** Планета КВН **18.00** Человек и закон **18.40** Погода **18.45** «Они сражались за Родину». Часть 2-я **19.45** Спокойной ночи, малыши! **20.00** Время **20.50** Приключенческий фильм «Туннель». **22.40** Хоккей. Чемпионат мира. Сборная Швеции - Сборная Беларуси.

7.00, 8.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. **7.20** Телеспецназ: «Дежурная часть». **8.40** «Арена - спорт». Тележурнал. **9.20** «Цыганка». Сериал. **10.05** «Санта-Барбара». Сериал. **15.40** Мультфильмы. **16.30** «Башня». **16.55** Диалоги о рыбалке. **17.25** «Кино +ТВ». История в кино. **18.25** «Вино-шоу-кур». Развлекательная программа. **19.45** «Дикий ангел». Сериал. **20.45** Хоккей. Чемпионат мира. Сборная Финляндии - сборная Словакии. **23.35** Телеспецназ: «Дежурная часть». **23.05** «Мода + ТВ». Тележурнал. **0.45** Горячая десятка.

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры. **7.20** После новостей... **7.50** «Случайные встречи». Худ. фильм. **9.25** Ноу-хау. **9.40** Отечество и судьбы. «Бенуа». Часть 2-я. **10.10** Музыка и стихи старого Арбата. **10.40** К 55-летию Победы. **11.40** «Кровавая свадьба». Худ. фильм. **12.50** Сергей Юрский читает стихи И.Бродского. **13.15** Архитектурная галерея. «Архитектура как скульптура». **13.45** Мультфильмы. **14.30** «Дворцовые тайны». «Герой Чесмы». **15.00, 17.30** Новости. **15.10** Д.Шостакович. Сюита «Болт». **15.30** «Преображение». Док. фильм. **17.05** «Планета людей». Антуан де Сент-Экзюпери. **17.40** Новое кино. **18.05** Власть факта. **18.20** М.П.Мусоргский. «Картинки с выставки». Исполняет Сергей Тарасов. **18.50** «Осенние портреты». Сэдда Пумпянская. **19.15** Вечерняя сказка. **19.50** К 55-летию Победы. Документальные фильмы. **20.40** После новостей. **21.00** «Случайные встречи». Худ. фильм. **22.30** Джазофрения.

5.00 Сегодня утром. **5.15, 7.10, 7.45** Спорт, погода. **5.20, 6.15** Криминал. **5.35, 6.20** Карданный вал. **5.50, 7.15** Впрок. **6.35** Мультфильм. **7.50** Час сериала. «Бандитский Петербург». Фильм-1-й. «Барон». 3-я серия. **9.00, 11.00, 13.00. 15.00, 18.00, 21.00** Сегодня. **9.25** Большие родители. **10.00** Дог-шоу «Я и моя собака». **10.35** Профессия - репортер. Кирилл Кикнадзе. «Постучавший в рай». **11.30** «Старый телевизор» вспоминает. Фильм Романа Кармена «Неизвестная война». «Последнее сражение неизвестной войны». **13.35** Наше кино. «Зося». **15.30** Сериал «Лоск и Кларк. Новые приключения супермена». **16.25** Худ. фильм. «Фронт за линией фронта». 2-я серия. **18.40** Премьера НТВ. «Бандитский Петербург». Фильм 1-й. «Барон». 4-я серия. **19.50** Премьера НТВ. Геннадий Хазанов «Жил-был я...». **20.35** Профессия - репортер. Игорь Воеводин «Возвращение «Красного Октября». **21.45** Премьера НТВ. «Белые пески» . **23.35** «Антропология».

ПЯТНИЦА, 5 МАЯ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.30 Новости **8.15** «Нежный яд». Сериал **9.15** «Каламбур». Юмористический журнал **9.45** Человек и закон **10.30** Сериал «Новые приключения Синдбада». **13.30** Программа «Вместе». **14.20** Мультсериал «Невероятные приключения Джонни Квеста». **14.40** Что да как **15.00** Юные гладиаторы в программе «Царь горы». **15.25** ...До шестнадцати и старше **16.00** «Нежный яд». Сериал **17.30** Джентльмен-шоу **18.00** Документальный детектив. Операция «Берлинское противостояние». Дело 1956 года **18.30** Вкусные истории. **18.45** Поле чудес **19.45** Спокойной ночи, малыши! **20.00** Время **20.50** Триллер «Зазубренное лезвие». **22.50** Хоккей. Чемпионат мира. Матч команд финальной группы.

7.00, 8.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. **7.20** Телеспецназ: «Дежурная часть». **8.30** Тысяча и один день. **8.50** «Арена - спорт». Тележурнал. **9.20** «Цыганка». Сериал. **10.05** «Санта-Барбара». Сериал. **15.25** Мультфильмы. **16.30** «Башня». **16.55** Сиреневый туман. **17.25** «К-2» представляет: Олег Табаков и его театр в программе Владимира Оренова «Фрак народа». Часть 2-я. **18.25** Клуб «Белый попугай». **19.45** «Дикий ангел». Сериал. **20.45** Хоккей. Чемпионат мира. Матч команд финальной группы. **23.30** Время кино. Джеф Фейхи в триллере «Мечта каждой женщины». **1.10** Телеспецназ: «Дежурная часть».

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры. **7.20** После новостей... **7.40** «Театр одного художника». К.Сомов. **8.00** «Милый друг давно забытых лет...» Худ. фильм. **9.35** Зарубежное документальное кино. «Великолепие Гершвина». **10.30** «Гулливер в Лилипутии». Телефильм. **11.40** «Колдовская любовь». Худ. фильм. **13.45** Мультфильмы. **14.20** Х.Родриго. Концерт «Аранхуэс» для гитары с оркестром. Солист А.Фраучи. Дирижер Е.Светланов. **14.45** Живое дерево ремесел. **15.00, 17.30** Новости. **15.10** Кино - детям. «Чародей». **15.35** «Беседы о русской культуре». Авторская программа Ю.Лотмана. Передача 11-я. **16.15** Поклонникам Терпсихоры. **16.30** «Гулливер в Лилипутии». Телефильм. **17.40** «Культура вне границ». Посольство Португалии. **18.10** Pro memoria. «Война». **18.20** «Дом актера». «10 лет газете «Да». **19.00** Вечерняя сказка. **19.10** «Болек и Лелек на каникулах». Мультсериал. **19.50** Зарубежное документальное кино. «Великолепие Гершвина». **20.45** После новостей... **21.05** «Милый друг давно забытых лет...» Худ. фильм. **22.40** Знакомые мелодии.

НТВ **5.00** Сегодня утром. **7.50** Час сериала. Александр Домогаров, Кирилл Лавров и Лев Борисов в детективном сериале «Бандитский Петербург». Фильм 1-й. «Барон». 4-я серия. **9.00, 11.00, 13.00. 15.00, 18.00, 21.00** Сегодня. **9.25** «Экстремальные ситуации». Программа Н.Фоменко. **10.25** Служба спасения. **11.30** «Старый телевизор» вспоминает. фильм Романа Кармена «Неизвестная война». «Солдат неизвестной войны». **13.25** Наше кино. Николай Скоробогатов, Анатолий Горин и Игорь Фокин в фильме «Летняя поездка к морю». **15.30** Сериал «Лоис и Кларк. Новые приключения супермена» (США). **16.25** К 55-летию Победы. Худ. фильм. «Фронт в тылу врага». 1-я серия. **18.40** Премьера НТВ. Александр Домогаров, Кирилл Лавров и Лев Борисов в детективном сериале «Бандитский Петербург». Фильм 1-й. «Барон». 5-я серия. **19.50** Премьера НТВ. Геннадий Хазанов «Жил был я...». **20.35** Профессия - репортер. Ольга Надточей. «Алмазный берег». **21.45** Премьера НТВ. Джим Керри в комедии «Эйс Вентура. Розыск домашних животных» (США). **23.25** Песни с Фоменко. **0.10** Программа передач на завтра.

СУББОТА, 6 МАЯ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.15 Новости **8.15** «Нежный яд». Сериал **9.15** Джентльмен-шоу **9.45** Документальный детектив. Операция «Берлинское противостояние». Дело 1956 года **10.10** Смак **10.30** Сериал «Новые приключения Синдбада». **13.30** Программа «Вместе». **14.15** Мультазбука **14.40** Страна чудес. Тайны Востока в фильме «И еще одна ночь Шахерезады». **16.00** «Нежный яд». Сериал **17.30** Песня года **18.20** Погода **18.25** Надежда Румянцева и Виталий Соломин в боевой комедии «Крепкий орешек». **19.45** Спокойной ночи, малыши! **20.00** Время **20.50** Наталья Андрейченко в мелодраме «Военно-полевой роман». **22.35** Хоккей. Чемпионат мира. Матч команд финальной группы.

Россия **7.00, 8.00, 16.00, 19.00, 22.00** Вести. **7.20** Телеспецназ: «Дежурная часть». **8.40** «Арена - спорт». Тележурнал. **9.20** «Цыганка». Сериал (Аргентина). **10.05** «Санта-Барбара». Сериал (США). **16.35** Акуна матата. «Я - чеченка». **17.15** Дежурная часть. **17.45** Гараж. **18.25** «Городок». Развлекательная программа. **19.45** «Дикий ангел». Сериал (Аргентина). **20.45** Премьера. Агата Кристи. Пуаро. «Убийство на поле для гольфа» (Великобритания). **22.30** Премьера. Агата Кристи. Пуаро. «Убийство на поле для гольфа» (Великобритания). Продолжение. **23.20** «Панорама». Тележурнал. **0.15** Последний сеанс. Роберт Вул в комедии «Открытый сезон» (США). **1.55** Телеспецназ: «Дежурная часть».

9.05 «Читая Библию». Ветхий Завет. **9.15** «Российский курьер». Калужская область. **9.55** «Много верст в походах пройдено». Исполняет Алексей Покровский. **10.35** «В поисках Олуэн». Мультипликационный фильм. **11.00** «Аистенок». Тележурнал для детей. **11.30, 13.30, 19.30, 23.00** Новости культуры. **11.40** К 85-летию О.Уэллса. «Мистер Аркадин». Худ. фильм. **13.45** «Дикие лебеди». Мультипликационный фильм. **14.40** Поэтические позвонки. В.Маяковский. Авторская программа А.Симонова. **15.00, 17.30** Новости. **15.10** Кино - детям. «Чародей». **15.35** Берега Набокова. «Такой русский американский писатель». **16.05** «Час судьбы». Док. фильм. Режиссер С.Стародубцев. **16.35** «П.И.Чайковский. Избранное». Симфония ь 5. Исполняет АБСО. Дирижер В.Федосеев. **17.40** «Мир авиации». Тележурнал. **18.05** К 55-летию Победы. Е.Носов. «Красное вино победы». Телеспектакль. **19.00** Вечерняя сказка. **19.10** «Болек и Лелек на каникулах». Мультсериал (Польша). **19.50** К 55-летию Победы. «Пахнет гарью четыре года». Режиссер В.Токарская; «Право на смерть». Режиссер И.Голубева. Документальные фильмы. **20.40** После новостей... **21.00** «Опасности любви». Худ. фильм.

7.00 Сегодня утром. **7.00, 7.30** «Сегодня утром». Информационная программа. **7.10, 7.45** Спорт, погода. **7.15** Впрок. **7.50** Час сериала. Александр Домогаров, Кирилл Лавров и Лев Борисов в детективном сериале «Бандитский Петербург». Фильм 1-й. «Барон». 5-я серия. **9.00, 11.00, 13.00. 15.00, 18.00, 21.00** Сегодня. **9.25** Наше кино. Вячеслав Тихонов, Михаил Пуговкин и Леонид Быков в фильме «Майские звезды». **11.30** «Старый телевизор» вспоминает. «Неизвестная война. О создании документального сериала». **13.25** Наше кино. Галина Макарова, Галина Скоробогатова и Борислав Брондуков в фильме «Вдовы». **15.30** Сериал «Лоис и Кларк. Новые приключения супермена» (США). **16.25** К 55-летию Победы. Худ. фильм. «Фронт в тылу врага». 2-я серия, заключительная. **18.35** «Один день». Программа К.Набутова. **19.05** Наше кино. «Ворошиловский стрелок». **21.45** Мир кино. Тимоти Далтон в боевике «Джеймс Бонд - агент 007». «Лицензия на убийство» . **0.05** Ток-шоу «Про это».

ВОСКРЕСЕНЬЕ, 7 МАЯ

ОРТ **7.00, 9.00, 11.00, 14.00, 17.00** Новости **7.10** Служу России! **7.40** «Дисней-клуб». «Аладдин». **8.10** Утренняя звезда **9.10** Галина Польских и Евгений Евстигнеев в фильме «Верность». **10.45** Торжественная церемония вступления в должность Президента Российской Федерации В.В.Путина. **12.05** Худ. фильм «Единственная дорога». **14.15** «Дисней-клуб». «101 далматинец». **14.40** «Дисней-клуб». «Новые приключения Винни-Пуха». **15.10** Умницы и умники **15.35** «Эх, Семеновна!» Всероссийский частушечный суперкубок **16.15** «Северный конвой PQ-00». **17.15** П.И.Чайковский. «Торжественная увертюра «1812». **17.35** Михаил Ульянов в исторической эпопее «Великий полководец Георгий Жуков». **20.00** Время **21.00** К 55-летию Великой Победы. Трансляция праздничного концерта **23.05** Хоккей. Чемпионат мира. Матч команд финальной группы.

7.00 Папа, мама, я - спортивная семья. **7.55** Служу Отечеству. **8.20** «Устами младенца». Телеигра. **8.50** Прогноз погоды. **8.55** Доброе утро, страна. **9.30** «Аншлаг» и Кш. **10.15** «Городок». Из раннего». Развлекательная программа. **10.45** Торжественная церемония вступления в должность Президента Российской Федерации В.В.Путина. **12.00** Вести. **12.20** *Парламентский час.* **13.10** «Новая «Старая квартира». **13.55** Диалоги о животных. **14.55** Чемпионат мира по автогонкам в классе «Формула-1». Гран-при Испании. Трансляция из Барселоны. **17.00** Фильм недели. Джулия Ормонд и Харрисон Форд в мелодраме Сиднея Поллака «Сабрина» (США). **19.00** Торжественная церемония вступления в должность Президента Российской Федерации В.В.Путина. **20.55** Праздничный концерт, посвященный Дню радио. **22.45** Хоккей. Чемпионат мира. Матч команд финальной группы. **0.55** «За круги своя». Док. фильм.

9.05 «Читая Библию». Новый Завет. **9.15** «Аистенок». Тележурнал для детей. **9.40** Детский сеанс. «Капитан пилигрима». Худ. фильм. **11.15** Фестиваль моноспектаклей. «1945-й». Исполняет Валентин Никулин. **12.20** Из Чайковского... **13.00** «Мой Эрмитаж». Авторская программа М.Пиотровского. **13.30, 21.00** Новости культуры. **13.45** Кино по выходным. «О любви». Худ. фильм. **15.00** Былое в лицах. «Последняя муза Бориса Пастернака». **15.55** Положение вещей. **16.20** Адрес - «Театральная площадь». **17.10** «Говорит Москва». Док. фильм.. **17.30** Новости. **17.35** «Что наша жизнь...» Телефильм. **18.15** Вечерняя сказка. **18.25** «Счастливого пути». Мультсериал. **18.35** «Соло трубы». Док. фильм. **19.20** «К 55-летию Победы». Концерт мастеров искусств из Гостелерадиофонда. **21.20** «Кто там...» Авторская программа В.Верника. **21.45** «Подранки». Худ. фильм.

6.55 Анонс дня. **7.00, 9.00, 11.00, 15.00, 18.00** Сегодня. Мир приключений и фантастики. **7.15** «Закон джунглей». **7.40** Наше кино. «Тимур и его команда». **9.20** Телеигра «Ключи от форта Байяр». **10.10** «Полундра». Семейная игра. **10.40** Профессия - репортер. Ольга Надточей. «Алмазный берег». **11.30** Служба спасения. **12.00** Путешествия натуралиста. **12.30** Наше кино. «Хроника пикирующего бомбардировщика». **13.55** «Свидетель века». Программа Владимира Кара-Мурзы. Елена Ржевская в фильме «8 мая 1945 года». **14.20** «Женский взгляд» Оксаны Пушкиной. **15.30** Большие родители. **16.05** Документальный сериал «Холодная война». **17.00** Сериал по выходным. «Она написала убийство». **18.40** К 55-летию Победы. «Офицеры». **20.25** Премьера НТВ. «Красный день календаря». Фильм Леонида Парфенова из цикла «Новейшая история». **21.30** Премьера НТВ. «Умирать легко». **23.10** Премьера НТВ. «Тина Тернер. Поет королева рока».



ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА «ЗГОДА»
выдаецца з 1992 г.
Заснавальнік і галоўны рэдактар: Аляксей Кароль
Заснавальнікі: Т.Г. Мельнічэнка, В.А. Кароль
Індэкс: 63138. **Рэгістрацыйны нумар:** 582.
Адрас рэдакцыі: г. Мінск, 220004, вул. Ракаўская, 27.
Надрукавана з дыяпазітываў заказчыка
на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» ВПП імя Я.Коласа,
г. Мінск, 220073, 1-шы Загарадны зав., 3.
Тыраж: 4 тыс. экз. **Заказ нумар:** 1231.
Падпісана да друку: 27.04.2000г. **Кошт дагаворны.**